**Тэма 6.2 Новыя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краін Захаду ў сярэдзіне 70 – х гг. ХХ ст. – пачатку ХХІ ст.**

1. Структурныя эканамічныя крызісы сярэдзіны 70 – х – пачатку 80-х гг. Пераход ды інфармацынага грамадства.

2. Неакансерватыўныя пераўтварэнні 1980-х гг.

3. Посткансерватыўная палітыка канца ХХ – пачатак ХХІ ст.

4. Развіццё ліберальнай парламенцкай дэмакратыі. Змяненне ў расстаноўцы сіл на міжнароднай арэне.

**Літаратура**


Лазько, Р. Р. Навейшая гісторыя краін Еўропы і Амерыкі 1945-1999 гг. Вуч. дап. / Р. Р. Лазько– Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2000. – 120 с. (ГДУ)

Пономарев, М.В. История стран Европы и Америки в Новейшее время /М.В. Пономарев. – М.: Проспект, 2010. – 416 с. (Электр.)

Пленков, О. Ю. Новейшая история стран Европы и Америки / О. Ю. Пленков. – М.: Юрайт, 2016. – 398 с. (ГДУ)

Кузьмина, О. В. История новейшего времени / О. В. Кузьмина, Ю. Н. Ушаков. – М.: Издательский центр «Академия», 2013. – 400 с. (ГДУ)

Гісторыя навейшага часу : вучэб.-метад. дапам. У 2 ч. Ч. 2. 1945–2015 гг. / П. А. Шупляк [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2016. – 247 с. (Электр.)

Новейшая история стран Европы и Америки. XX век. В 3. ч. / Под ред. А. М. Родригеса и М.В.Пономарева. – М.: Гуманитар. Изд. Центр «Владос», 2001. – Ч. 2, 3. – 336 с. (Электр).

История новейшего времени стран Европы и Америки. 1945–2000 гг. / Под ред.Л. С. Белоусова, Е. Ф. Язькова и др. – М.: Простор, 2003. – 480 с. (Электр).


**1.** У 1973–1975 гг. заходнія краіны сутыкнуліся з моцным крызісам, які доўжыўся 18 месяцаў і прывёў да спаду вытворчасці на 11,8 % (ЗША – 15 %, Італія і Францыя – 14 %, ФРГ – 8 %, Вялікабрытанія – 7 %). У паслякрызісны перыяд 1976–1980 гг. эканамічнае развіццё было вельмі марудным і спалучалася з высокай інфляцыяй (10–12 % у год). З 1973 г. пачаўся хуткі рост беспрацоўя, узровень якога ў канцы 1970-х гг. дасягнуў 8–10 % эканамічна актыўнага насельніцтва. Асаблівасць крызіса была ў тым, што ва ўмовах інфляцыі не назіралася зніжэння цэн (стагфляцыя). Рост унутраных цэн у 1970-я гг. склаў 15–20 % у год. Гэта было ў многім вынікам традыцыйнага для кейнсіанства стымулявання попыту, калі спажыўцам выдзяляліся значныя сродкі, каб пераадолець затаварванне ранку, што вяло да дыфіцыту бюджэта і інфляцыі. У такіх умовах кейнсіанскія метады пераадолення крызісу аказаліся неэфектыўнымі. Эканамічны крызіс супаў з энергетычным крызісам, і ў значнай ступені быў ім выкліканы. Энергентычны крызіс стаў вынікам рэзкага росту цэн на нафту. У 1973 г. краіны – члены Арганізацыі экспарцёраў нафты (ОПЕК) прынялі рашэнне аб

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

павышэнні цаны на нафту з 3 да 11, 65 дол. за барэль. У 1982 г. бараль нафты каштаваў 34 дол.

У 1980–1982 гг. эканамічны крызіс паўтарыўся. Спад вытворчасці ў вядучых індустрыяльных краінах склаў 7–8 %. Перавытворчасць назіралася як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы. Крызісныя з’явы ў эканаміцы падарвалі і фінансавую стабільнасць. У пачатку 1970-х гг. пашатнулася становішча долара з-за вялікага дзяржаўнага доўга і дыфіцыта бюджэта ЗША. У 1973 г. была адменена прывязка долара да золата і тым самым былі адменены асноўныя прынцыпы Брэтанвудскай сістэмы. Гэта адмоўна паўплывала на міжнародныя эканамічныя сувязі. 1970-я гады сталі пераломнымі для развіцця індустрыяльнай эканамічнай мадэлі. Эканамічны крызіс даў штуршок пераходу ад індустрыяльнага да постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства.

Галоўнай прычынай эканамічных цяжкасцей 1970-х гг. была супярэчнасць паміж існуючай сістэмай дзяржаўнага рэгулявання і новымі эканамічнымі рэаліямі. Практыка паказала, што дзяржава па шэрагу прычын не можа хутка і эфектыўна правесці мадэрнізацыю эканомікі. Вырашэнне гэтай задачы сталі звязваць з больш дынамічным прыватным бізнесам. Перад заходнімі краінамі аб’ектыўна паўстала неабходнасць стварэння новай мадэлі эканамічнага развіцця, якая б дала больш свабоды прыватнай ініцыятыве. Адначасова паўстала неабходнасць карэкціроўкі сацыяльнай палітыкі. Высокія сацыяльныя расходы сталі адной з прычын росту падаткаў і інфляцыі. Частка насельніцтва лічыла за лепшае жыць на гэтыя выплаты, чым спрабаваць уласнымі сіламі палепшыць сваё становішча.

Крызіс сярэдзіны 1970-х – пачатку 1980-х гг. дазволіў зразумець абмежаванасць прыродных рэсурсаў. Рэзкі скачок цэн на нафту стаў важным фактарам структурнай перабудовы заходняй эканомікі. Нарошчванне вытворчасці далей на аснове ўсё большай перапрацоўкі мінеральных рэсурсаў і выкарыстання энерганосьбітаў станавілася немагчымым. Гэта вяло не толькі да вычарпання рэсурсаў, але і да пагаршэння ўмоў жыцця людзей, да экалагічнай катастрофы. Яскравым прыкладам абвастрэння экалагічных праблем можна лічыць “парніковы эфект”. У пошуках пераадолення гэтых праблем сфарміравалася ўяўленне аб неабходнасці пераходу да новай эканамічнай мадэлі, у аснове якой энерга- і рэсурсазберагаючыя тэхналогіі, выкарыстанне навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі. Пачынаецца пераход вядучых краін Захаду да інфармацыйнага грамадства. На месца экстэнсіўнаму тыпу вытворчасці прыходзіць інтэнсіўны.

Новы этам развіцця заходняга грамадства звязаны з пачаткам новага этапу НТР. З’явілася магчымасць выкарыстання міні-працэсараў для карэнных змен у прыладах працы (станкоў, машын) і перавод іх на шлях аўтаматызацыі. З’явілася магчымасць пераходу да комплекснай аўтаматызацыі на вытворчасці, што вяло рэзкага скарачэння патрэб у рабочай сіле на заводах і фабрыках. Рабочая сіла імкліва пераходзіць у сферу паслуг. У ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі ўжо ў сярэдзіне 1990-х гг. у сферы паслуг было занята 70–72 % рабочай сілы. Прычым тут занята

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

высокакваліфікаваныя рабочая сіла, звязаная з інфармацыйнымі паслугамі, якія маюць стратэгічнае значэнне для развіцця новай інфармацыйнай эканомікі. Скарацілася, у найбольш перадавых краінах да 25 %, доля работнікаў, занятых фізічнай працай. Імкліва змяншалася колькасць работнікаў у сельскай гаспадарцы. Агульная тэндэнцыя да росту долі высокакваліфікаванай рабочай сілы вядзе да росту аплаты працы. У краінах Захаду ў пачатку XXI ст. сфарміравалася грамадства 2/3 сярэдняга класа. У адносна цяжкім матэрыяльным становішчы знаходзяцца людзі, якія у сілу нізкай кваліфікацыі, адсутнасці адукацыі не могуць знайсці пастаяннай працы (каля 20 % насельніцтва).

Персанальны камп'ютар стаў асновай інфармацыйных тэхналогій. Першым камп'ютарам, які адпавядаў такім патрабаванням, быў створаны Сцівенам Вознякам і Сцівам Джобсам у 1977 г. У 1980 г. фірма Майкрасофт Біла Гейтса распрацавала праграмнае забеспячэнне для персанальнага камп'ютара, якое далей стала стандартам для інфармацыйнага забеспячэння ўсяго камп'ютарнага свету. У 1985 г. Майкрасофт распрацавала праграмнае забеспячэнне Windows. Гэтыя распрацоўкі далі магчымасць зрабіць рэвалюцыю ў аб'ёмах і скорасці апрацоўкі інфармацыі. Да канца 1990-х гг. з'явілася магчымасць кантактаў у інтэрнеце ў рэжыме рэальнага часу.

У рамках новай эканомікі, якая фарміруецца ў цеснай сувязі з новым камп'ютарным этапам НТР, веды і інфармацыя, якія прымяняюцца ў вытворчасці і абапіраюцца на дасягненні навукі, становяцца асноўнай крыніцай росту вытворчасці працы. Эканоміка становіцца інавацыйнай. Інавацыя – гэта комплексны працэс стварэння, распаўсюджвання і выкарыстання якіх-небудзь тэхнічных, тэхналагічных, арганізацыйных і іншых новаўвядзенняў. Вытворчасць у развітых краінах рухаецца ад стварэння матэрыяльных даброт і тавараў да вытворчасці інфармацыі. Вылічальная тэхніка, камп'ютар далі велізарныя магчымасці для павышэння эфетыўнасці вытворчасці, росту якасці прадукцыі. Зменшыўся кошт прадукцыі, час на яе вытворчасць. Гэта дае магчымасць перайсці ад масавай вытворчасці да вытворчасці штучнай якаснай прадукцыі. Арганізацыя вытворчасці мяняецца ад буйнамаштабнай да вытворчасці сіламі больш дробных вытворчых адзінак. Фарміруецца новы міжнародны падзел працы. Выгаднае месца краіны ў ім вызначаецца не столькі наяўнасцю прыродных рэсурсаў, ці таннай рабочай сілы, а здольнасцю ствараць новыя веды і хутка іх прымяняць праз інфармацыйны працэс у самых розных сферах дзейнасці людзей.

Найбольш хутка развіваецца серыя паслуг, асабліва – сектар інфармацыйных паслуг. У прамысловасці самымі дынамічнымі сталі высокатэхналагічныя галіны: электроннае і транспартнае машынабудаванне, авіякасмічная і хімічная прамысловасць, вытворчасць камп'ютараў. Харчовая і лёгкая прамысловасць зніжалі тэмпы вытворчасці.

З канца XX ст. адметнай рысай развіцця сусветнай эканомікі становіцца глабалізацыя. Пад ёй разумеюць пашырэнне і паглыбленне сацыяльных сувязей і інстытутаў такім чынам, што на штодзённае жыццё людзей усё

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

большы ўплыў аказваюць падзеі, якія адбываюцца ў іншых частках зямнога шара, а з другога боку дзеянні мясцовых супольнасцей могуць мець важныя глабальныя наступствы. Гэта працэс сусветнай эканамічнай, палітычнай і культурнай інтэграцыі і ўніфікацыі. У эканоміцы працэс глабалізацыі выражаецца перш за ўсё у тым, што ўсё большая колькасць краін і сектараў эканомікі ўключаюцца ў сусветны рынак тавараў і паслуг. Развіццё міжнародных камунікацый прывяло да з’яўлення сусветнага спажыўца. Вытворчасць камплектуючых частак, а затым і іх зборка адбываюцца ў розных частках свету. Гэта вядзе да росту ўзаемазалежнасці эканомік розных краін свету. Змяншаецца магчымасць урадаў асобных краін праводзіць аўтномную эканамічную палітыку. Глабалізацыя параджае неабходнасць каардынацыі эканамічнай дзейнасці ў сусветным маштабе, міжнароднай кааперацыі, лібералізацыі міжнароднага гандлю. У выкананні гэтых функцый важная роля належыць створанай у 1994 г. Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА), якая ўключае больш за 150 краін свету. Яе дзейнасць накіравана на ставарэнне роўных умоў для ўсіх удзельнікаў міжнароднага гандлю пры прадастаўленні некаторых ільгот найбольш бедным краінам.

Асноўным эканамічным наступствам глабалізацыі з’яўляецца міграцыя капітала, рабочай сілы, вытворчых рэсурсаў у планетарным маштабе. Адбываецца стандартызацыя заканадаўства, эканамічных і тэхналагічных працэсаў у сусветным маштабе. Назіраецца збліжэнне, узаемапранікненне, асіміляцыя некаторых культур. Свет становіцца больш узаемазвязаным, больш залежным ад усіх яго суб’ектаў.

Адначасова з глабалізацыяй у свеце актывізуецца працэс рэгіёнізацыі. На міждзяржаўным узроўні ён найбольш выразна праяўляецца ў інтэграцыйных працэсах (Еўрапейскі Саюз, ШАС, ЕўрАзЭС, НАФТА і інш.).

**2.** Палітычнай сілай, якая прапанавала новую мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця ва ўмовах крызісу кейнсіанскіх метадаў дзяржаўнага рэгулявання сталі неакансерватары. Іх эканамічная тэорыя ўключала два ключавыя моманты: манетарызм і тэорыя прапановы. Неакансерватары абвінавачвалі кейнсіанцаў тым, што тыя сваёй палітыкай актыўнага дзяржаўнага ўмяшання ў гаспадарчае жыццё прывялі да падрыву стымулаў прадпрымальніцкай ініцыятывы і працоўнай актыўнасці. Амерыканскія эканамісты Фрыдрых Хайек, Мілтан Фрыдман, шэраг спецыялістаў у Заходняй Еўропе выступілі з абгрунтаваннем неабходнасці вярнуць капіталістычнаму рынку яго здольнасць да самарэгулявання, выключыць непасрэднае ўмяшанне дзяржавы ў рэгуляванне эканамічных працэсаў. Неакансерватары сцвярджалі, што самі людзі, а не ўрады, лепш ведаюць, што ім патрэбна ў жыцці. Таму менавіта попыт на тавары і паслугі, а не дзяржава, павінен вызначаць, якія тавары і паслугі трэба вырабляць. Пры гэтым дзяржаўнае рэгуляванне не адвяргалася цалкам. Мяняліся яго акцэнты: дзяржава павінна была накіраваць свае намаганні на стымуляванне не попыту, а прпановы, г. з. вытворчасці. Для гэтага прапаноўвалася адмова ад прагрэсіўнага падаткаабкладання, зніжэнне ставак падаткаў на даходы і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыбыткі, ліквідацыя бюджэнага дыфіцыту, скарачэнне сацыяльных праграм (бо яны змяншаюць працоўную актыўнасць), прыватызацыя як сродак зніжэння бюджэтных выдаткаў і павышэння эфектыўнасці прадпрыемстваў. Ва ўмовах пераходу ад індустрыяльнай вытворчасці да інфармацыйна-тэхналагічнай, камп'ютарнай, а па форме арганізацыі – да дэцэнтралізаванай, такія ідэі знайшлі пацвярджэнне на практыцы і атрымалі значную падтрымку.

Неакансерватары выступілі таксама супраць прамых сацыяльных расходаў дзяржавы. Яны лічылі, што сацыяльныя праблемы павінны вырашацца перш за ўсё праз рост эканомікі. Людзі павінны забяспечваць свой дабрабыт за кошт эффектыўнай працы і прадпрымальніцкай дзейнасці. Што ж датычыцца дзяржаўнай дапамогі, то неакансерватары адзначалі, што яна ажыццяўляецца без належнага кантролю і праверкі, у якой ступені чалавек сапраўды можа на яе прэтэндаваць, зніжае стымулы да працы. Але неакансерватары не адмовіліся цалкам ад сацыяльнай палітыкі. Яны зрабілі больш жорсткімі ўмовы атрымання дзяржаўнай дапамогі і ўвялі эканамічныя стымулы, які павінны былі прымусіць чалавека імкнуцца знайсці добрааплачваемую працу.

Праграма неакансерватараў уключала пашырэнне духоўнай і палітычнай свабоды асобы, ліквідацыю ўсеўладнасці дзяржавы. Яны прапагандавалі вяртанне да традыцыйных культурных і маральных каштоўнасцей: сям'я, уласнасць, рэлігія. На іх думку чалавек павінен быць вольным ад прымусавай аднолькавасці. У грамадстве павінны існаваць ролзныя класы, розніца ў эканамічных умовах, няроўнасць паміж людзьмі ў сацыяльна-эканамічнай сферы. Неакансерватары выступалі за больш жорсткае супрацьстаянне з сацыялістычным лагерам.

Неакансерватыўныя канцэпцыі былі ўспрыняты кансерватыўнай партыяй у Вялікабрытаніі, рэспубліканскай – у ЗША, хрысціянскімі дэмакратамі – у ФРГ, галістамі – у Францыі. У 1980-я гг. названыя партыі прыходзяць да ўлады і пачынаюць ажыццяўляць неакансерватыўную палітыку на практыцы. Але ў розных краінах яна мела свае асблівасці.

У 1980-я гг. вядучыя краіны Захаду ўзначалілі прыхільнікі неакансерватыўнай дактрыны, як Рональд Рэйган (прэзідэнт ЗША 1981–1989 гг.), Маргарыт Тэтчэр (прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі 1979–1990 гг.). Сацыяльна-эканамічная палітыка, якую яны ажыццяўлялі, атрымала назву, адпаведна, "рэйганоміка" і "тэтчэрызм". У яе аснове ляжала стратэгія зніжэння бюджэтных расходаў, прыватызацыя (для ЗША не так актуальна з-за адсутнасці значнага дзяржаўнага сектара) і змяншэнне рэгулюючай ролі дзяржавы ў эканоміцы і сацыяльнай сферы. Дзяржава параджала шматлікія інструкцыі і правілы, якія часта скоўвалі прадпрымальніцкую ініцыятыву і тармазілі абнаўленне эканомікі на новым этапе НТР. Да таго ж, размеркавальная сістэма кейнсіанства патрабавала велізарнай бюракратыі, на ўтрыманне якой ішлі вялікія сродкі. Іх варта было накіраваць на стымуляванне вытворчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

I ў ЗША, і ў Вялікабрытаніі адбывалася зніжэнне прамых падаткаў і павялічваліся ўскосныя падаткі. Тым самым стымуляваліся капіталаўкладанні ў эканоміку і імкненне людзей шмат і эфектыўна працаваць. Цяпер стымулявалася вытворчасць, а не попыт, як гэта рабілі неаліberalы. Важнейшую задачу сваёй эканамічнай палітыкі Р. Рэйган і М. Тэтчар бачылі ў зніжэнні інфляцыі. Для гэтага трэба было зменшыць бюджэтны дыфіцыт. Каб дасягнуць названай мэты прымяняліся непапулярныя меры. Так, у Вялікабрытаніі былі зменшаны датацыя дзяржаўным прадпремствам, якія не падпалі пад прыватызацыю (доля дзяржсектара зменшылася з 10 да 6 %). Скарачалася дапамога рэгіёнам, якія знаходзіліся ў стане эканамічнай дэпрэсіі. Былі ўрэзаны расходы на сацыяльную сферу. У ЗША таксам адбылося скарачэнне сацыяльных расходаў, замарожваліся зарплаты дзяржаўным служачым. Прыватызацыя прывяла да росту беспрацоўя. Пры гэтым кола асоб, якія мелі права на атрыманне дапамогі па беспрацоўю, а таксама тэрміны яе атрымання змяншаліся. Как зламаць супраціўленне непапулярным мерам, вялося наступленне на прафсаюзы. Палітыка неакансерватараў уключала зніжэнне падаткаў. У рамках “рэйганомікі” верхняя падатковая стаўка знізілася на 30 %.

Неакансерватары лічылі неабходна аказваць падтрымку тым формам арганізацыі бізнеса і галінам эканомікі, якія яны разглядалі як прынцыпова важнымі для нацыянальнай гаспадаркі: малы бізнес, навукаёмістыя вытворчасці. У 1979–1992 гг. дзяржава на Захадзе забяспечвала каля паловы фінансавання навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх распрацовак (НДВКР). Пры гэтым асноўная частка дзяржаўных сродкаў асвойвалася прыватным бізнесам на конкурснай аснове. Зніжаліся падаткі для тых кампаній, якія накіроўвалі сродкі на НДВКР. Малы бізнпес стымуляваўся за кошт падатковых ільгот.

Рэформы Тэтчэр хутка сталі прыносіць станоўчыя вынікі. Прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў прывяла да росту вытворчасці працы і зніжэння цэн. Акрамя таго, яна дала бюджэту 27 млрд дол. Дзякуючы прыватызацыі прадпрыемстваў і муніцыпальнага жылля многія брытанцы сталі акцыянерамі (у 1986 г. – 16 %) і ўласнікамі нерухомасці. М. Тэтчэр назвала гэта народным капіталізмам. “Рэйганоміка” забяспечыла рост амерыканскай эканомікі. У 1980–1990 гг. ВУП вырас на 18 %, было створана 20 млн. новых рабочых месц. У Вялікабрытаніі ВУН вырас за той жа час на 23 %. Выраслі даходы насельніцтва, але назіралася нераўнамернасць іх роста. Найбольшы выйгрыш ад роста эканомікі атрымалі вышэйшыя класы ЗША і Вялікабрытаніі.

У ФРГ ажыццяўленне неакансерватыўнай палітыкі звязана з дзейнасцю ўрадаў, якія ўзначальваў лідар ХДС/ХСС Гельмут Коль у 1982–1998 гг. Тут некансерватыўная палітыка не была такой яскрава выражанай, як ў ЗША і Вялікабрытаніі. Урад Коля значна зменшыў ролю дзяржавы ў эканамічным жыцці краіны, якая ўзрасла ў 1970-я гг. у час знаходжання ва ўладзе СДПГ. Была праведзена дэнацыяналізацыя. У руках дзяржавы засталіся толькі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прадпрыемствы, якія па словах Г, Коля, “былі неабходны для грамадскай карысці”. Рынак стаў галоўным рэгулятарам гаспадарчага жыцця. Але пры гэтым захавалася значная сацыяльная абароненасць немцаў. Фактычна ФРГ вярнулася да мадэлі сацыяльнай рынкавай эканомікі з улікам новых абставін, звязаных з новым этапам НТР і глабалізацыяй. Рост ВУП у Германіі ў 1980-я гг. склаў 19 %.

Свае асаблівасці мела распаўсюджванне неакансерватыўнай хвалі на Францыю. Прэзідэнтам краіны ў 1981–1995 гг. з’яўляўся сацыяліст Франсуа Мітэран. Толькі ў 1984–1986 гг. у час знаходжання ва ўладзе ўрада на чале з галістам Ж. Шыракам была зроблена спроба ажыццявіць ў Францыі рэформу ў духу неакансерватызму. Але яна выклікала незадавальненне ў грамадстве і супрацьдзеянне прэзідэнта і не атрымала развіцця. Тым не менш, у Францыі была праведзена прыватызацыя 65 дзяржаўных кампаній і банкаўскіх груп. Гэта прынесла ў бюджэт 50 млрд. дол. Колькасць акцыянераў у Францыі вырасла з 2,5 млн. да 10 млн. Знізіліся стаўкі падаткаабкладання. Рост ВУП за 1980-я гг. склаў 19 %.

Як бачна з прыведзеных данных, неакансерватыўная палітыка змагла забяспечыць значны рост ВУП у 1980-я гг. Але рэакцыя на рэформы неакансерватараў у грамадстве была неадназначнай. Асабліва адмоўнай была рэакцыя тых, хто прывык да сістэмы шырокіх дзяржаўных сацыяльных гарантый.

**3.** У 1990-я гады да ўлады ў краінах Захаду прыходзіць новае пакаленне палітычнай эліты. Яно пачало адыход ад класічных прынцыпаў неакансерватызу. Пачаўся пераход да посткансерватыўнай палітыкі. Калі для неакансерватызму была характэрна высокая ступень ідэалагізацыі пры адстойванні той сацыяльна-эканамічнай палітыкі, якую яны праводзілі, то цяпер на першы план выступае прагматызм. Ідэалагічны ўплыў на гаспадарчае жыццё слабее. Штуршком для перагляду стартэгіі эканамічнага развіцця стала рэцэсія пачатку 1990-х гг., калі тэмпы эканамічнага росту знізіліся да 1,5–2 %. Яна ў значнай ступені была звязана са знешнім фактарам – кувейтскім крызісам. Ён выклікаў рост цэн на нафту да 56 дол. за барэль. Эле хутка цэны ўпалі, новага “нафтавага шоку” не адбылося. У 1994 г. сусветная эканоміка выйшла на сярэднія за апошнюю чвэрць стагоддзя тэмпы развіцця – 3,5 %. У спрыяльных эканамічных умовах з’явілася магчымасць адмовіцца ад палітыкі “жорсткай эканоміі”, якую ў 1980-я гг. праводзілі неакансерватары. Гэты курс адстойвалі шматлікія палітыкі ў вядучых краінах Захаду: Біл Клінтан у ЗША, Энтані Блэр у Вялікабрытаніі, Л. Жаспен у Францыі, Герхард Шродар у Германіі, Раман Продзі ў Італіі. Прычым, сярод іх былі прадстаўнікі як ліберальных, так і сацыял-дэмакратычных партый. Наяўнасць агульных рыс у праводзімай імі палітыцы – яшчэ адно пацвярджэнне зніжэння ўплыву ідэалагічнага фактара на эканамічную палітыку ўрадаў краін Захаду.

У пэўнай ступені пачалося вяртанне да традыцый сацыяльнай дзяржавы, шырокай сацыяльнай дзяржаўнай палітыкі. Але гэта не было вяртанне да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кейнсіанства. Гэта была спроба знайсці найбольш збалансаваны варыянт эканамічнай палітыкі, якая найлепш спалучала б рынначны механізм з высокай сацыяльнай абаронай чалавека. Ключавую ідэю абноўленай эканамічнай стратэгіі сфармуляваў Б. Клінтан. Ён заклікаў амерыканцаў не толькі карыстацца працвітаннем сёння, але і інвеставаць значна больш у працвітанне заўтра. У рамках гэтай стратэгіі адміністрацыя Клінтана накіравала фінансавыя сродкі на вырашэнне дзвюх асноўных задач – развіццё высокіх тэхналогій і вырашэнне сацыяльных праблем. У 1998 г. была прынята пяцігадовая праграма фінансавання НДВКР. Яна прадугледжвала шырокае фінансаванне праграм, якія былі нацэлены на павелічэнне фонду агульных навуковых ведаў і праграм, нацэленых на распрацоўку прыкладных праблем і стварэнне тэхналогій.

Важным напрамкам новай эканамічнай стратэгіі стала канверсія вытворчасці ў сувязі з завяршэннем "халоднай вайны". У краінах Заходняй Еўропы да сярэдзіны 1990-х гг. канверсія пацягнула за сабой ліквідацыю 600 тыс. рабочых месц. Адбывалася зліццё многіх фірм, якія працавалі ў ваенна-прамысловым комплексе. Былі пераарыентаваны многія НДВКР, якія раней былі звязаны з ваеннай сферай.

Важным напрамкам навукова-прамысловага рэгулявання заставалася ўмацаванне экалагічнай бяспекі вытворчасці. У другой палове 1980-х – 1990-я гг. у краінах Захаду была створана заканадаўчая база, якая значную частку выдаткаў па забеспячэнню экалагічнай бяспеккі ўсклала на прыватны бізнес. Напрыклад, у ЗША прыватныя фірмы сталі аплочваць 60 % выдаткаў на прыродаахоўныя мерапрыемствы, у ФРГ – 37 %. Раслі і бюджэтныя затраты краін Захаду на прыродаахоўныя мерапрыемствы.

У 1990-я гг. актывізавалася сацыяльная палітыка. Затраты на яе склалі каля 50 % выдаткаў бюджэтаў краін Захаду. Але прынцыпы ажыццяўлення сацыяльнай палітыкі ў параўнанні з "дзяржавай дабрабыту" істотна змяніліся. Быў адкінуты прынцып універсальнасці, усеагульнасці сацыяльнага забеспячэння як сродка падтрымання масавага спажывецкага попыту. Сацыяльная падтрымка стала мэтавай. Узмацніўся кантроль за яе атрыманнем. Зменшылася бюракратызацыя. Стаў больш паслядоўна рэалізоўвацца прынцып узаемасувязі паміж плацяжамі ў старахавыя фонды і атрыманнем дапамогі. Была захавана лінія неакансерватараў на камерцыялізацыю сістэм аховы здароўя і адукацыі, але без прыватызацыі. У гэтых сферах шырока прымяняліся рынкавыя метады аказання паслуг, прыцягваўся прыватны бізнес на кантрактных умовах. Нарошчванне дзяржаўных выдаткаў адбывалася ў вялікай ступені за кошт дзяржаўных пазык.

Новая эканамічная палітыка забяспечыла не надта вялікі, але стабільны рост экономікі ў сярэдзіне 1990-х гг. (каля 2% у год, у ЗША – 3,9 %). У цэлым паспяхова краіны Захаду справіліся з наступствамі азіяцкага фінансавага крызісу 1998 г. і з вынікамі тэрарыстычнай атакі 11 верасня 2001 г. У апошнім выпадку ў многім дзякуючы актыўнай антыкрызіснай палітыцы ЗША. Але тэмпы тосту сусветнай экономікі заставаліся нізкімі – 2–2,5 %.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У 2008 г. свет сутыкнуўся з фінансава-эканамічным крызісам. Эканамічны рост у канцы XX ст. быў шмат у чым абумоўлены будаўнічым бумам, велізарнымі ўкладаннямі капіталу ў будаўнічую галіну. У той жа час іншыя сферы эканомікі адчувалі недахоп капіталу. Цыклічны сусветны эканамічны крызіс суправаджаўся фінансавым, ён пачаўся ў верасні 2008 г. у ЗША. Пачатак яго звязваюць з іпатэчным крызісам, калі мільёны амерыканцаў не змаглі выплачваць крэдыты на будаўніцтва жылля. Усё гэта прывяло да фінансавай катастрофы асобных банкаў, а потым і ўсёй фінансавай сістэмы. У верасні 2008 г. стаў банкрутам адзін з вядучых банкаў ЗША "Леман Бразерз". Пасля гэтага ў ЗША і Заходняй Еўропе пачалася ланцуговая рэакцыя банкруцтва найбуйнейшых банкаў і рэзкі спад ўзроўню вытворчасці. Кошт акцый найбуйнейшых кампаній да лістапада 2008 г. абваліўся прыкладна на 40 %. У ЗША за першыя 5 месяцаў крызісу страцілі працу каля 3 млн чалавек. Да канца 2009 г. узровень беспрацоўя ў ЗША вырас да 10 %. Крызісныя з'явы і цяжкасці ў развіцці найбуйнейшай у свеце эканомікі ЗША, глабальны характар эканамічных сувязяў прывялі да таго, што эканамічны крызіс у ЗША хутка перакінуўся на іншыя краіны і набыў сусветныя маштабы.

Многія буйныя амерыканскія і еўрапейскія прадпрыемствы і фірмы ва ўмовах крызісу востра мелі патрэбу ў фінансавых сродках. Яны звярнуліся за дапамогай да дзяржавы, якая была вымушана ратаваць ад банкруцтва многія банкі і кампаніі, укладваючы ў іх велізарныя капіталы. Ва ўзмовах крызісу рэзка ўрасла рэгулюючая роля дзяржаўны ў эканоміцы і фінансах, а таксама ў сферы сацыяльнай палітыкі. У ходзе сусветнага эканамічнага і фінансавага крызісу выявілася, што некаторыя еўрапейскія дзяржавы апынуліся ў становішчы буйных даўжнікоў, практычна на мяжы банкруцтва. У гэтых умовах Еўрапейскі Саюз аказаў дапамогу Грэцыі, Іспаніі, Партугаліі і некаторым іншым дзяржавам Еўропы з мэтай стабілізацыі іх фінансаў.

Каб аздаравіць сваю фінансавую сістэму, у канцы 2009 г. урад ЗША знізіў падаткі на малы бізнес, а таксама пашырыў падатковыя льготы для сярэдняга і буйнога бізнесу. Былі вылучаныя і дадатковыя сродкі на выплату дапамог па беспрацоўі. Для крызісу 2008 г. характэрна павольнае эканамічнае развіццё пасля яго завяршэння. Розныя краіны і рэгіёны выходзілі з вострай фазы крызісу ў розны час, з 2009 па 2013 год. У 2016 г. дырэктар-распарадчык Міжнароднага валютнага фонду Крысцін Лагард адзначыла, што "сусветная эканоміка ў цяперашні час усё яшчэ пакутуе ад наступстваў крызісу 2008 года". У 2018 г. МВФ адзначаў, што наступствы крызісу 2008 г. захоўваюцца дагэтуль, выяўляючыся ў прыватнасці ў павольным эканамічным росце: большасць эканомік так і не вярнулася да дакрызісных тэмпў росту (напрыклад, тэмпы росту ВУП у развітых краінах складалі 3% у 2006, 2% у 2018) і павелічэнні дзяржаўных даўгоў (сярэдняе суадносенне дзярждоўгу да ВУП вырасла з 36 да 52 %).

**4.** Найважнейшай рысай палітычнага развіцця краін Захаду ў апошняй трэці XX – пачатку XXI ст. стала развіццё ліберальнай парламенцкай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дэмакратыі. Працэсы дэмакратызацыі праходзілі ў краінах, дзе ва ўладзе яшчэ знаходзіліся дыктатарскія і аўтарытарныя рэжымы. Так у красавіку 1974 г. у выніку "рэвалюцыі гваздзікоў" паў аўтарытарны рэжым у Партугаліі. Канстытуцыя 1976 замацавала дэмакратычны рэжым у гэтай краіне. У тым жа 1974 г. у Грэцыі была звергнута ваенная хунта, Канстытуцыя 1975 г. зацвердзіла дэмакратычную прэзідэнцкую рэспубліку. У тым жа годзе ў Іспаніі памёр дыктатар Франсіска Франка, у наступным годзе былі праведзены дэмакратычныя выбары, у 1978 г. была прынята канстытуцыя, якая замацавала рэжым канстытуцыйнай манархіі. Пасля ліквідацыі спробы правых сіл здзейсніць дзяржаўны пераварот у 1981 годзе, урад сфарміраваў лідар сацыялістычнай рабочай партыі Фэліпэ Гансалес.

Тэндэнцыя да ўмацавання ліберальнай дэмакратыі ў свеце праявілася і ў падзенні дыктатарскіх рэжымаў у шэрагу краін Лацінскай Амерыкі. У 1983 г. – у Аргенціне, у Бразіліі – у 1985 г., 1989 г. – у Чылі. У гэтых краінах ўсталяваліся парламенцкія рэжымы і шматпартыйная плюралістычныя сістэмы. Умацаванне ліберальнай дэмакратыі ў сусветным маштабе праявілася і ў сувязі з крахам савецкай мадэлі сацыялізму. Краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, якія раней будавалі гэты сацыялізм, пайшлі па шляху ліберальнай дэмакратыі. Распад сацыялістачнага лагера прывёў да краху камуністычнага руху ў міжнародным маштабе.

Як ужо адзначалася, яшчэ адной тэндэнцыяй развіцця краін захад з канца 1970-х гг. стаў прыход да ўлады ў шэрагу краін (ЗША, Вялікабрытанія, ФРГ) правых сіл, якія праводзілі неакансерватыўную палітыку. Правакансерватыўная хваля закранула і малыя краіны Заходняй Еўропы, а лібералы і цэнтрысты апынуліся ў стане апазіцыі. Напрыклад, у 1981–1982 гадах неакансерватары прыйшлі да ўлады ў Нарвегіі, Даніі, Бельгіі, Нідэрландах. На неакансерватыўныя пазіцыі перайшлі традыцыйныя кансерватыўныя партыі, як рэспубліканцы ў ЗША, кансерватары ў Вялікабрытаніі. Неакансерватызм прынялі ў якасці сваёй ідэалогіі хрысціянска-дэмакратычныя партыі, перш за ўсё ХДС/ХСС у ФРГ. Нарастанне нэакансерватыўнай хвалі прывяло да таго, што пазіцыі названых партый у палітычным жыцці краін Захаду ў 1980-я гг. значна ўмацаваліся. Але ўжо да пачатку 1990-х гадоў неакансерватыўная хваля пачала спадаць.

Аднак зрух управа ў бок неакансерватызму адбыўся ў краінах Захаду не адначасова і не ўсюды. Так у Францыі на выбарах 1981 г. перамог блок левых сіл, лідар сацыялістаў Ф. Мітэран стаў прэзідэнтам, а сацыялісты пры падтрымцы камуністаў заваявалі большасць у Нацыянальным Сходзе. Толькі ў 1986 сацыялісты пацярпелі паражэнне на парламенцкіх выбарах, і большасць у Нацыянальным Сходзе атрымалі правыя (неагалісты). Праз два гады сацыялісты зноў вярнуліся да ўлады.

Акрамя Францыі ў пачатку 1980-х сацыял-дэмакраты прыходзілі да ўлады ў Грэцыі, Іспаніі, Партугаліі, Швецыі. Але ў цэлым, у канцы 1970-х – 1980-я гг. палітычныя пазіцыі заходнееўрапейскіх сацыял-дэмакратаў аслаблі. Да другой паловы 1990-х гг. не маглі прыйсці да ўлады найбуйнейшыя сацыял-дэмакратычныя партыі Еўропы – СДПГ і

РЕПОЗИТОРИЙ ПГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Лейбарысцкая партыя. Аслабленне пазіцый сацыял-дэмакратаў стала фактарам, які спрыяў аслабленню на Захадзе прафсаюзнага руху. Гэта звязана з тым, што менавіта сацыял-дэмакратычныя партыі кантралявалі большасць прафсаюзаў. Пазіцыі прафсаюзаў таксама былі падарваныя і антыпрафсаюзнай палітыкай неакансерватараў. Таксама папулярнасць прафсаюзаў падала ў сувязі з ростам даходаў і зменамі ў сацыяльнай структуры грамадства і арганізацыі вытворчасці: павелічэнне колькасці людзей, занятых у сферы паслуг, у дробных фірмах, з высокімі даходамі.

З характэрных рыс палітычнага жыцця 1980-х гг. можна адзначыць адраджэнне крайне правых груповак (Нацыянальны фронт Ле Пена ў Францыі, Рэспубліканская партыя ў ФРГ), якія выступалі з пазіцый нацыяналізму, з асуджэннем ліберальнай іміграцкай палітык, інтэграцыі. Адбывалася кансалідацыя палітычных плыняў у рамках рэгіёнаў (Еўрапейская народная партыя, якая ўключыла хрысціянскіх дэмакратаў ФРГ і Італіі). Характэрнай рысай грамадска-палітычнага жыцця краін Захаду была і наяўнасць нацыянальна-этнічных канфліктаў (Паўночная Ірландыя ў Вялікабрытаніі, Краіна Баскаў у Іспаніі, Квебек ў Канадзе). Уносіў элемент дэстабілізацыі ў сацыяльна-палітычнае жыццё і рост іміграцыі.

У канцы 1990-х гг. у многіх еўрапейскіх краінах сацыял-дэмакраты адціснулі ад улады кансерватараў. У 1997 г. у Вялікабрытаніі прыйшоў да ўлады лейбарысцкі ўрад на чале з Э. Блэрам, а ў Францыі па выніках парламенцкіх выбараў быў сфармаваны ўрад з прадстаўнікоў левых партый. У 1998 г. канцлерам Германіі стаў лідар СДПГ Г. Шродар. Але сацыял-дэмакраты ў канцы XX ст. па сваёй ідэалогіі і палітыцы істотна змяніліся ў параўнанні з папярэднім перыядам. Яны адмовіліся ад канцэпцыі дэмакратычнага сацыялізму і ад статусу рабочых партый. Яны прэтэндуюць на тое, каб прадстаўляць інтарэсы шырокіх слаёў грамадства. Аснову іх сацыяльна-эканамічнай палітыкі складае прагматычны падыход з прарытэтам на рэгуляванне сацыяльна-эканамічных праблем праз рынкавыя механізмы.

У 2005 г. Г. Шродара змяніла на пасадзе канцлера прадстаўнік блока ХДС / ХСС А. Меркель, якая ўзначаліла ўрад “вялікай кааліцыі”, які складаецца з прадстаўнікоў хрысціянскіх дэмакратаў і сацыял-дэмакратаў. Яшчэ раней у Францыі на змену леваму ўраду прыйшоў урад з прадстаўнікоў правых партый. Разам з тым у сярэдзіне 10-х гг. XXI ст. у Іспаніі і Італіі правыя ўрада ў выніку парламенцкіх выбараў вымушаны былі саступіць уладу ўрадам на чале з сацыялістамі. У цэлым, кажуць пра тое, што ў пачатку XXI ст. у заходніх краінах да ўлады вярнуліся правыя сілы, адбылася новая “правая хваля”, але пад уплывам крызісу 2008–2009 гг. у шэрагу дзяржаў ўлада зноў перайшла да сацыял-дэмакратам, аднак працэс не быў настолькі маштабным, каб гаварыць аб новай “левай хвалі” на Захадзе.

З канца XX ст. у палітычным жыцці заходніх краін пачаўся працэс, які атрымаў назву “крызіс сістэмных партый”. Прычынай яго ўзнікнення стала тое, што галоўныя левыя і правыя партыі, знаходзячыся ва ўладзе, праводзілі амаль аднолькавую палітыку. У выніку сярод насельніцтва пачало распаўсюджвацца перакананне, што краінамі кіруе палітычная эліта, якая не

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

звяртае ўвагі на інтарэсы грамадзян. Праявай крызісу стала пратэстнае галасаванне або рост абсэнтэізму на выбарах. Крызіс выявіўся і ў павелічэнні аўтарытэту т. зв. несістэмны партый. У левым лагеры сярод такіх вылучыліся экалагічныя партыі, якія ў 1980-х – 1990-х гг. узмацнілі пазіцыі ў многіх заходніх краінах, або левапапулісцкія арганізацыі, папулярнасць якіх стала павялічвацца пасля крызісу 2008–2009 гг. Аднак, нягледзячы на поспехі ў Іспаніі (Подемос) і Грэцыі (SIRIZA), пакуль цяжка казаць пра перспектывы гэтай палітычнай сілы. Вялікім аўтарытэтам сярод насельніцтва заходніх краін карыстаюцца правыя несістэмныя партыі (ультраправыя або правапапулісцкія). Цэнтральнае месца ў іх праграмах займае прапанова рашучай барацьбы з нелегальнай іміграцыяй, з якой яны звязваюць рост беспрацоўя, злачыннасці і наркаманіі, пагрозу культурнай тоеснасці. Правапапулісцкія партыі таксама выступаюць за ўсталяванне кантролю над буйнымі кампаніямі, за вяртанне да пратэкцыяністкай палітыкі, супраць паскарэння інтэграцыйных працэсаў у Еўропе. З пачатку XXI ст. правапапулісты пачалі ўзмацняць свае палітычныя пазіцыі на выбарах і ў шэрагу заходніх краін сталі ствараць канкурэнцыю галоўным правым партыям. Напрыклад, у Францыі партыя "Нацыянальны фронт" стала трэцяй палітычнай сілай краіны і атрымала рэальныя магчымасці ўмяшацца ў барацьбу за ўладу на мясцовым і агульнанацыянальным узроўні.

Крах сацыялістычнага лагера, распад СССР прывялі да карэнных змен ў расстаноўцы сіл на міжнароднай арэне. Перастаў існаваць біпалярны свет. ЗША сталі адзінай звышдзяржавай. З распадам сацыялістычнага лагера закончылася "халодная вайна". Сімвалам яе заканчэння стала аб'яднанне Германіі, у выніку чаго ўзнікла магутнейшая эканамічная дзяржава. Заканчэнне "халоднай вайны" і крах камуністычных рэжымаў у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы прывялі да імкнення да іх інтэграцыі ў эканамічныя і ваенна-палітычныя структуры Захаду. У 1999 г. першыя былыя сацыялістычныя краіны (Польшча, Чэхія і Венгрыя) былі прыняты ў НАТО, а ў 2004 г. першая група постсацыялістычных краін была прынята ў ЕС.

У канцы XX – пачатку XXI ст. новай з'явай у міжнародных адносінах стала тое, што ва ўмовах глабалізацыі ў свеце значна ўзрасла роля міжнародных арганізацый. Яны нацэлены на кардынацыю намаганняў па вырашэнню глабальных праблем чалавецтва. Прыкметнае павышэнне актыўнасці міжнародных арганізацый і рост іх колькасці стварае перадумовы для трансфармацыі сістэмы міжнародных адносін. Яна заключаецца ў фарміраванні сусветнай супольнасці, у рамках якой самаарганізацыя і рэгуляванне грамадскіх працэсаў у свеце ў цэлым будзе ажыццяўляцца не толькі праз узаемадзеянне дзяржаў, а непасрэдна міжнароднымі арганізацыямі. На міжнароднай арэне з'яўляецца ўсё больш неўрадавых арганізацый, якія дзейнічаюць паралельна з дзяржавамі і становяцца ўдзельнікамі міжнародных адносін. Па дадзеных ААН ў пачатку 2000-х гг. у свеце дзейнічала каля 50 тыс. неўрадавых арганізацый.

Сярод міжнародных арганізацый найбольш аўтарытэтнай застаецца ААН. Але ў 1990-я – 2000-я гг. яна сутыкнулася з шэрагам праблем, у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыватнасці пры правядзянні міратворчых аперацый. Тут на месцы ААН усё актыўней выступае НАТО. Савет Бяспекі ААН перастаў быць структурай, якая адлюстроўвае рэальны ўплыў некаторых дзяржаў у свеце (Германія, Японія, Бразілія).

У свеце на сучасным этапе ўзмацняюцца інтэграцыйныя працэсы. Гэта не толькі ЕС. У 1989 г. створана Азіяцка-Ціхаакеанскае эканамічнае супрацоўніцтва (АПЕК). У 1992 г. ЗША, Канада, Мексіка стварылі Паўночнаамерыканскую асацыяцыю свабоднага гандлю (НАФТА). У 1993 г. Аргенціна, Бразілія, Уругвай і Парагвай стварылі зону свабоднага гандлю МЕРСОКУР.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ